*Да 250-годдзя з дня нараджэння*

# КУЛЬТУРА ПАЎСЯДЗЁННАСЦІ МІХАЛА КЛЕАФАСА АГІНСКАГА Ў ЗАЛЕСКІ ПЕРЫЯД ЖЫЦЦЯ І ТВОРЧАСЦІ

## ПАВОДЛЕ ЎСПАМІНАЎ ГРАФА КАНСТАНЦІНА ТЫШКЕВІЧА

У еўрапейскай, у тым ліку і ў беларускай, гуманітарыстыцы налічваецца шмат навуковых і папулярных выданняў, прысвечаных мастацка-творчай, палітычнай і грамадскай дзейнасці Міхала Клеафаса Агінскага (1765 – 1833) [1 – 5]. У агінсказнаўстве сфарміраваўся таксама мемуарны кірунак. Сярод літаратуры названага жанру вылучаюцца ўспаміны графа Канстанціна Піевіча Тышкевіча, беларускага гісторыка, археолага і краязнаўцы (1806 – 1868), які паходзіць з беларускай графскай лініі. Род Тышкевічаў даў нашай Айчыне плеяду славутых навукоўцаў, даследчыкаў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа, дзеячаў мастацтва. Адным з іх быў Канстанцін, які шмат сіл і сродкаў ахвяраваў навуцы, вывучэнню культуры Міншчыны. Старажытны Лагойск, з яго замкам, навакольнымі гарадзішчамі і курганамі з часоў дахрысціянскай мінуўшчыны выклікаў вялікую цікавасць графа Тышкевіча. З вывучэння лагойскіх старажытнасцей і пачалася яго навукова-археалагічная і краязнаўчая дзейнасць.

У 1857 г. К. Тышкевіч арганізаваў на ўласныя сродкі экспедыцыю па рацэ Віліі. У Лагойску былі пабудаваны судны, іх волакам даставілі ў вёску Камена, адкуль і пачалося падарожжа. За чатыры месяцы яго ўдзельнікі прайшлі 682 вярсты – ад Вілейкі да Коўна. Падчас вандравання было наведана каля 300 вёсак і мястэчак. Фалькльорны, этнаграфічны і археалагічны матэрыял, сабраны экспедыцыяй, лёг у аснову кнігі “Вілія і яе берагі” [7], якая была выдадзена ў Дрэздэне ў 1871 г. і стала адзінай у Еўропе манаграфіяй, дзе этнічны рэгіён даследаваўся шляхам рачнога падарожжа. Кніга аздоблена графічнымі малюнкамі Артура Бартэльса, якія ён выконваў з натуры на шляху па Віліі, што робіць выданне яшчэ больш каштоўным.

Як успамінаў К. Тышкевіч, на пачатку чэрвеня 1857 г. члены экспедыцыі прычалілі непадалёку ад дарогі, якая вяла ў Паўночныя Афіны. Аматары-краязнаўцы скарысталіся магчымасцю наведаць славутую мясціну. Уражанням ад Залесся і яго гаспадара аўтар прысвяціў шосты раздзел згаданай кнігі [7, s. 75 – 93]. Вандроўнікаў здзівіла прыгажосць дарогі, абсаджанай бярозамі і іншымі дэкаратыўнымі дрэвамі. К. Тышкевіч тлумачыць, што гэта справа рук “вялікага суайчынніка нашага краю Міхала Клеафаса Агінскага, які пасля заканчэння грамадскай кар’еры, стаміўшыся ад шматгадовай працы, ад грузу цяжкіх абавязкаў, вырашыў тут сваю старасць сустрэць” [7, s. 82]. Граф піша пра дзейнасць М. Агінскага, сцісла характарызуе яго дзяржаўныя пасады ў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Фрагментарнасць агляду палітычнай дзейнасці князя аўтар тлумачыць тым, што раней гэта зрабілі ўжо іншыя. “Званні і заслугі перад Айчынай гэтага мужа, – піша К. Тышкевіч, – нас не тычацца – гісторыя Краю іх ужо



**Палац Агінскіх у Залессі на выяве Напалеона Орды.**

апісала дастаткова, кожны гэта павінен чытаць і ведаць" [7, s. 82].

Больш дэталёва аўтар кнігі "Вілія і яе берагі" спыняецца на гісторыі палацава-паркавага комплексу, якая ў XIX ст. была яшчэ малавядомай: "Мы ж, каго вецер прыбіў да гэтых берагоў на хвіліну, апішам толькі некалькі штрыхоў малавядомых, але яскравых" [7, s. 82]. Ён адзначае, што маёнтак Залессе "ад даўняга часу належаў князям Агінскім. Пасля смерці Тадэвуша, ваяводы Трокскага, дастаўся сям'і Ксаверыя Агінскага, кухмістра Вялікага Княства Літоўскага. Той, калі ў 1802 г. перанёс рэзідэнцыю сваю ў Маладзечна, саступіў Залессе свайму пляменніку М. К. Агінскаму" [7, s. 82]. К. Тышкевіч адзначае, што стары палац, пабудаваны ў французскім стылі, быў занядбаны, і новы гаспадар, вырашыўшы ўладкаваць тут сабе ўтульны куток на старасць, заняўся яго перабудовай. У кнізе даецца апісанне месца, дзе ўзводзіўся палацава-паркавы комплекс. Аўтар не шкадуе фарбаў пры абмалёўцы прыроды Залесся: "Пабудавалі палац паміж Бабрынкай і Рудзіцай, дзвюма рэчкамі, што нясуць воды да сваёй маці Віліі" [7, s. 82].



**Палацава-паркавы комплекс ў Залессі.** Сучасны выгляд.

Ён паведамляе таксама, што ўзводзілі палац найлепшыя архітэктары Вялікага Княства Літоўскага М. Шульц і Ю. Пусэр. Мураваны палац, вырашаны ў стылі класіцызму, уяўляе сабой двухпавярховы Г-падобны будынак. Галоўны прамавугольны корпус мае сіметрычна-восевую кампазіцыю з 2-павярховымі бакавымі павільёнамі і цэнтральнай мансардавай часткай, вылучанай 4-калонным дарычным порцікам і вежачкай з гадзіннікам. Заходняе крыло галоўнага фасада завяршаецца 2-павярховым павільёнам.

Палац пабудавалі за чатыры гады (1802 – 1805), а стварэнне ўсяго ансамбля доўжылася яшчэ амаль два дзесяцігоддзі. У наступныя пасля ўзвядзення палаца гады быў закладзены батанічны сад. К. Тышкевіч адзначаў, што ў садзе "расліны надзвычай рэдкія, прывезеныя з Вільні прыродазнаўцамі Юндзілам і Струмілам. Нямала дэкаратыўных раслін было прыслана са Шчорсаў Я. Храптовічам" [7, s. 82]. На тэрыторыі рэзідэнцыі былі дзве аранжарэі. Фасад першай раздзялялі паўкалоны і высокія арачныя вокны. Другая аранжарэя размяшчалася перпендыкулярна першай і мела над адным з фасадаў суцэльныя нахіленыя вокны.

Беларускія даследчыкі сведчаць, што побач з палацам была ўзведзена 8-гранная капліца з шатровым дахам, інтэр'еры якой былі багата аздоблены архітэктурным жывапісам. Адным з элементаў ансамбля з'яўляўся шпацырны звярынец з дарожкамі, абсаджанымі дрэвамі і рознымі кветкамі. У звярынцы стаялі дзве мураваныя альтанкі: паўкруглая з 4-калонным порцікам, высокімі шклянымі дзвярыма і авальнымі вокнамі і круглая 2-павярховая "кітайская" з драўляным бельведэрам і завяршэннем у выглядзе трох кветак. Яшчэ адзін звярынец з дзікімі жывёламі месціўся за ракой Бабрынкай і быў абнесены магутнай драўлянай агароджай.

Экспедыцыя К. Тышкевіча захаплялася прыгажосцю пейзажнага парку ў рамантычным стылі, закладзенага знакамітым садоўнікам Я. Пеўзнерам на берагах Бабрынкі, абапал шпацырнага звярынца. Парк з'яўляўся эстэтычным аналагам навакольнага прыроднага ландшафту. У ім лугі ўпрыгожваліся "партэрамі" кветак і кветкавымі клумбамі. Ад палаца і з іншых месцаў парку адкрываліся далёкія перспектывы на натуральныя пейзажы. Прылеглыя лес, пойма ракі, возера – усё гэта ўвасабляла бясконцую прыгажосць прыроды.

Паркавыя кампазіцыі Залесся ў значнай ступені вызначаліся тапаграфіяй і геамарфалагічнымі ўмовамі мясцовасці. Так, у паніжанай паўночна-заходняй частцы быў вялікі (2 *га*) вадаём з астравамі. На тэрасах паўночна-ўсходняй часткі парку былі сфарміраваны пейзажныя насаджэнні пераважна з ліпы і вяза. Парк перасякаўся цэнтральнай алеяй, якая была яго асноўным структурна-кампазіцыйным элементам. Акцэнтам перспектывы з'яўляўся заходні востраў з перакідным мосцікам. У парку была збудавана вежа са шпілем, некалькі рамантыч-

ных альтанак, што называліся “святынямі”, устаноўлены памятныя камяні ў гонар Т. Касцюшкі і французскага педагога Ж. Ралея. Лічыцца, што надпіс “Ценям Касцюшкі” на валуне высек сам М. Агінскі.

Граф К. Тышкевіч і яго сучаснікі лічылі Паўночныя Афіны сапраўднай архітэктурна-паркавай дасканаласцю дзівоснай прыгажосці. З закінутага, паўразбуранага драўлянага палаца ў Залессі быў створаны велічны палацава-паркавы комплекс. Граф распавядае, што паэт А. Ходзька быў так уражаны прыгажосцю гэтых мясцін, якія наведаў у 1821 г. разам з бацькам Янам, што прысвяціў ім цэлую паэму “Залессе”. У перакладзе на французскую мову яна была выдадзена ў Польшчы, але, на жаль, у Беларусі твор не быў вядомы. На думку К. Тышкевіча, гэта выдатная паэма, дзе А. Ходзька параўноўваў Залессе з Зуфіяўкай Трэмбіцкага і Пулавай Вароніча [7, s. 83].

Большую частку раздзела, прысвечанага Залессю, аўтар кнігі “Вілія і яе берагі” адводзіць паўсядзённай культуры гаспадара Паўночных Афін. К. Тышкевіч прыводзіць тэкст, у якім М. Агінскі тлумачыць, чаму вырашыў пасяліцца ў Залессі: “Мой узрост і здароўе прымушаюць мяне да заканчэння маёй кар'еры і да пошуку спакою і адпачынку ў дамашняй цішыні. Пражыў я жыццё бурнае і багатае ўспамінамі на службе Краю з таварышамі” [7, s. 82]. Вобраз князя К. Тышкевіч падае з вялікай сімпатыяй. Ён піша, што М. Агінскі ўсю маладосць і найлепшыя гады жыцця правёў у элітарным атачэнні, сярод манаршых двароў і найвышэйшых слаёў грамадства. Так, у 1780-я гг. ён быў надзвычайным паслом у Галандыі, выконваў сакрэтную дыпламатычную місію ў Лондане. У туманным Альбіёне быў прадстаўлены каралю Георгію III, меў з ім і каралевай гутарку. Там жа ён сустракаўся з герцагамі ўэльскім, ёркскім і кларэнскім, а таксама з прэм'ер-міністрам Уільямам Пітам, з якімі абмяркоўваў дыпламатычныя пытанні. Пасля вяртання з эміграцыі ў Расію князь быў у прыязных стасунках з Аляксандрам I, неаднаразова сустракаўся з імператарам у Пецярбургу, Вільні, Віцебску, Магілёве. У віленскім палацы М. Агінскага часта збіраліся вядомыя прадстаўнікі палітычнай эліты Рэчы Паспалітай: А. Чартарыйскі, А. Тызенгаўз, Ю. Суліstroўскі, А. Прозар, Т. Ваўжэцкі, М. Ромер, С. Валовіч, Л. Плятэр, Д. Радзівіл. Падчас гэтых сустрэч, як сведчаць дакументы, абмяркоўваліся важныя праблемы эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця краіны. Цесныя стасункі падтрымліваў М. Агінскі з рэктарам Віленскага ўніверсітэта, матэматыкам, філосафам і астраномам Я. Снядзецкім, яго братам, прафесарам хіміі і медыцыны А. Снядзецкім, прафесарам натуральнай гісторыі і батанікі С. Юндзілам, прафесарам архітэктуры М. Шульцам, прафесарам медыцыны Ё. Франкам.

Канстанцін Тышкевіч заўважае, што М. Агінскі засвоіў многія тагачасныя навукі. Гэтае меркаванне пацвярджаюць працы сучасных айчынных і замежных даследчыкаў яго жыцця і творчасці. Так, у маладым узросце князь пад кіраўніцтвам прагрэсіўнага французскага педагога Жана Ралея атрымаў грунтоўную рознабаковую адукацыю (дарэчы, Ж. Ралей у свой час быў выхавальнікам эрц-герцага Леапольда – будучага аўстрыйскага імператара). У Гузаве настаўнік пражыў 11 гадоў, дзе выхоўваў і навучаў юнага Міхала. Сярод абавязковых прадметаў былі старажытная гісторыя і гісторыя Новага часу, лацінская, французская, нямецкая і польская мовы і літаратура, палітэканомія, грамадзянскае права, геаграфія, батаніка, матэматыка, геаметрыя, каліграфія, нумізматыка, танцы. Па ўласнай ініцыятыве М. Агінскі вывучаў астраномію, у 1799 г. у Гамбургу наведваў курсы хіміі.

Шчыры і добры настаўнік, якім быў Ж. Ралей, дапамог юнаку засвоіць найважнейшыя палажэнні філасофіі рамантызму, прынцыпамі якога на працягу ўсяго жыцця кіраваўся Міхал Клеафас. У мемуарах М. Агінскі пісаў: “Мой настаўнік удыхаў у мяне ідэі свабоды, якія грунтаваліся на ідэях хрысціянства, што прымушала глядзець на чалавека як на брата. Аднойчы, калі, раззлаваўшыся, я аблаяў і ўдарыў аднаго са слуг сваіх бацькоў, ён загадаў мне цалаваць таму ногі ў прысутнасці іншых. Мне было тады 10 гадоў”.

У працэсе музычнага выхавання князь атрымаў таксама глыбокія музычна-тэарэтычныя веды. Так, асновы кампазітарскага пісьма ён засвоіў пад кіраўніцтвам Восіпа Казлоўскага. Дарослым М. Агінскі ўдасканальваў музычныя навыкі ў славутых віртуозаў: Ё. Вёльфля, Ж. Адама, Дж. Віёці, П. Баё, Ш. Ляфона.

Па сведчанні К. Тышкевіча, князь Міхал быў не толькі надзвычай адукаваны, але і надзелены ад прыроды талентам і прадстаўнічай знешнасцю, умеў дакладна і з “панскай манерай” данесці ўласную думку. “Усім гэтым ён здабыў усеагульную сімпатыю ў кампаніі. Асабліва прыхільнымі да яго былі жанчыны, яны з-за яго шалелі, і ён іх кахаў таксама” [7, s. 84]. К. Тышкевіч лічыў, што пачуцці кампазітара выразна адчуваюцца ў музычных творах. “Вядомыя яго кампазіцыі (паланэзы) напоўнены тымі пачуццямі і меланхоліяй, такой узнёслай

і сумнай гармоніяй. Душа і розум чалавека ў спакойным і будзённым стане ствараць такое не здольны. Неабходна было моцна кахаць і быць каханым, каб нарадзіўся такі чулліві і чароўны мастацкі твор".

Князь Міхал пакінуў дзяржаўную службу ў 1815 г., і з гэтага часу Залессе стала яго любімай рэзідэнцыяй. К. Тышкевіч сцвярджае, што паўсядзённая культура Залесся была "багатая і разнастайная" [7, s. 82]. Кожны дзень у палац наведваліся шматлікія дваране, суседзі. Рэзідэнцыя М. Агінскага "ператварылася ў цэнтр збораў і сустрэч і новы асяродак грамадскага жыцця і навін. Усе галоўныя фігуры Кароны і Літвы наязджалі сюды і пра лёс краіны ў князя цэлымі тыднямі гаварылі" [7, s. 82]. І ў адстаўцы ён працягваў удзельнічаць у грамадскім жыцці. Так, К. Тышкевіч сведчыць, што князь "падтрымліваў пастаянную сувязь з Пецярбургам праз шматлікіх фельд'егераў" [7, s. 82].

Дзень М. Агінскага быў падзелены на дзве часткі. Першая прысвячалася дзяржаўным і грамадскім справам, навуцы. Раніца пачыналася з чытання карэспандэнцый, дыктавання тэкстаў лістоў, афіцыйных прыёмаў, агляду гаспадарчых спраў, сустрэчы гасцей. А першай гадзіне дня члены сям'і і госці збіраліся на снеданне. Другая частка дня адводзілася культурным імпрэзам, сярод якіх галоўным было музіцыраванне. Пасля прагулак па маляўнічых берагах Віліі і алеях парку ўсе вярталіся ў палац. Там, як піша К. Тышкевіч, "госці займаліся ўлюбёнымі справамі: хто любіў музыку, той яе слухаў, хтосьці любаваўся жывапіснымі палотнамі, некаторыя чыталі газеты і часопісы. Хто хацеў, адпачываў у адведзеных апартаментах. На абед усе зноў збіраліся разам і частаваліся цудоўнымі стравамі і дарагімі вінамі" [7, s. 82]. Граф прыводзіць цікавы эпізод, які яскрава сведчыць пра гасціннасць князя Міхала: "Аднойчы за абедам адзін са знакамітых гасцей М. Агінскага паведаміў, што ў адной з еўрапейскіх краін яго пачаставалі вельмі смачным страсбургскім паштэтам, і самае дзіўнае было тое, што яго прывезлі адтуль гарачым. Князь запомніў гэты аповед і вырашыў зрабіць будучым гасцям сюрпрыз. Чарговы абед знакамітасцей быў прызначаны праз трынаццаць дзён. Напярэдадні М. Агінскі паслаў у Страсбург фельд'егера з наказам прывезці на званы абед паштэт гарачым. У прызначаны дзень усе госці сабраліся ў Залессі, надышоў час абеду, а фельд'егер яшчэ не прыбыў. Князь раз-пораз з нецярплівасцю пазіраў у акно. Гасцей запрасілі за стол і абед пачаўся. Падалі амаль усе стравы, а доўгачаканага пасланца ўсё яшчэ не было. І калі ўжо князь страціў надзею, у сталовую залу зайшоў слуга і паведаміў, што прыбыў фельд'егер. Князь быў вельмі задаволены і загадаў падаць паштэт на стол. Радасць стала ўсеагульнай, калі госці пакаштавалі паштэт, прывезены гарачым са Страсбурга" [7, s. 83].

Вечары ў Залессі, куды пастаянна паступалі з Еўропы новыя музычныя кампазіцыі, звычайна прысвячаліся музычна-літаратурным імпрэзам. М. Агінскі дасканала ведаў італьянскія і французскія оперы, сам пісаў фартэпіянныя п'есы, паланэзы, мазуркі, вальсы і рамансы. Пад уплывам рамантызму ў яго сфарміравалася глыбокая цікавасць да музычнага мастацтва. На наш погляд, з усіх відаў мастацтва наш слынны суайчыннік вышэй за ўсё цаніў музыку. Ён лічыў, што толькі ў музыцы мастацтва набліжаецца да таямніц жыцця, да самых глыбінных асноў быцця. Рамантычны культ музыкі як сутнасці самой культуры, яе жыццёвай сілы і заключанага ў ёй творчага пачатку знайшоў увасабленне ў багатай музычнай творчасці М. Агінскага. У трактаце "Лісты пра музыку" (1828) ён адзначаў: "Немагчыма з большай годнасцю і з такім розумам выявіць перавагу гэтага прыгожага мастацтва і даць зразумець яго вялікую сілу ўздзеяння на звычаі з мэтай іх выпраўлення і змякчэння" [4, с. 28].

Мастацка-творчай дзейнасцю, што разгортвалася ў розных кірунках і ахоплівала ўсе формы тагачаснага музычнага жыцця, М. Агінскі пачаў займацца ў 1790-я гг. Дарэчы, некаторыя даследчыкі выказваюць меркаванне, што кампазітар з'яўляецца аўтарам музыкі песні "Яшчэ Польшча не загінула", якая стала польскім нацыянальным гімнам. Асабліва плённым быў залескі перыяд. Менавіта тут князь Міхал стварыў знакаміты паланэз "Ля мінор", вядомы пад назвай "Развітанне з Радзімай". Тут таксама былі напісаны і іншыя музычныя творы. К. Тышкевіч лічыў, што "паланэзы тыя ствараліся ў Залессі на аснове ўспамінаў пра мінулае і на новых матывах і пачуццях, якія сэрца князя не забывала" [7, s. 84]. Пра тое, што залескі перыяд творчай дзейнасці М. Агінскага быў кульмінацыйным, гавораць і сучасныя музыказнаўцы. Кампазітарам быў заснаваны музычны салон, добра вядомы за межамі Беларусі. На думку беларускіх даследчыкаў А. Ахвердавай і А. Капілава, гэты салон быў "асяродкам сур'ёзнай музычнай дзейнасці, дзе зборы праводзіліся рэгулярна, мелі пастаянны склад выканаўцаў і слухачоў, на канцэрты запрашаліся знакамітыя выканаўцы" [3, с. 7]. Пра гэта паведамляе таксама польскі гісторык і публіцыст Ч. Янкоўскі, які пісаў: "У Залессі звычайна выконваліся квартэты альбо якія-небудзь новыя творы. Сам

князь звычайна іграў першую скрыпку; Эскудэра – іспанец па паходжанні, вельмі добры скрыпач – іграў другую скрыпку" [6]. Сярод славутых гасцей князя К. Тышкевіч называе вядомага італьянскага кампазітара Д. Паліяні, які іграў на фартэпіяна і спяваў арыі. Віртуозна выконвала на фартэпіяна складаныя музычныя творы дачка Агінскага Амелія, яна таксама сачыняла паланэзы, добра малявала і захаплялася паэзіяй.

Прыгажосць палаца-паркавага ансамбля і асаблівая творчая атмасфера Паўночных Афін прыцягвала шматлікіх аматараў мастацтваў. У розныя гады ў Залессі працяглы час жыў дырэктар імператарскіх тэатраў Восіп Казлоўскі, які быў настаўнікам музыкі ў сясцёр імператара, а таксама навучаў ёй М. Агінскага ў дзяцінстве, на працягу ўсяго жыцця заставаўся яго дарадцам, музычным крытыкам і выдаўцом шэрагу твораў. Супрацоўніцтва двух кампазітараў было асабліва цесным у пецярбургскі перыяд іх жыцця, калі князь Міхаіл прыехаў у расійскую сталіцу пасля эміграцыі (1802). Менавіта В. Казлоўскі апублікаваў у Пецярбургу два яго зборнікі паланэзаў і рамансаў на італьянскія і французскія тэмы. У сваю чаргу М. Агінскі на ўласныя сродкі выдаў два зборнікі музычных твораў В. Казлоўскага. У архіве кампазітара захоўваецца альбом Восіпа Антонавіча з перапісанымі ім творамі князя.

Творчае супрацоўніцтва і шчырае сяброўства нашых славутых суайчыннікаў працягвалася і ў залескі перыяд. Паводле ўспамінаў графа К. Тышкевіча, "пайшоўшы ў ганаровую адстаўку з узнагародамі і вялікай пенсіяй, В. Казлоўскі пераехаў у Залессе і на музычных імпрэзах іграў на віяланчэлі" [7, s. 84]. Там ён сачыніў шэраг цікавых і арыгінальных кампазіцый. Вядома, што В. Казлоўскі захапляўся напісаннем музычна-тэатральных твораў. Вынікам назірання за жыццём залескіх сялян стала музыка да сцэнічнага твора "Жнеі, або Дажынкі ў Залессі".

Аўтар кнігі "Вілія і яе берагі" з цеплынёй піша пра яшчэ адну адметнасць М. Агінскага. Ён любіў быць у цэнтры ўвагі тагачаснага соцыуму, цешыўся, калі ў кулуарах пра яго пераказвалі розныя байкі, нават анекдоты. "Аднойчы, – распавядае К. Тышкевіч, – падчас прагляду пошты сярод шматлікай карэспандэнцыі ён убачыў раскошна выдадзены за мяжой адзін з яго паланэзаў. Яго насмяшыла выява на вокладцы, дзе мастак намаляваў цудоўную бярозу, пад якой сядзеў князь з прыстаўленым да скроні рэвальверам. А ў прадмове паведамлялася, што кампазітар не змог перанесці суму, меланхоліі, настальгіі, якімі быў перапоўнены яго паланэз, і застрэліўся" [7, s. 84].

Такія ўяўленні сучаснікаў пра экзістэнцыяльны стан князя выкліканы тым, што для рамантыка М. Агінскага былі характэрны абвостранае пачуццё суб'ектыўнасці, жаданне вярнуць некалі страчаны стан шчасця і спакою, туга па дасканалым, якому няма месца ў рэальным жыцці і якое ўвогуле не мае ніякіх пэўных абрысаў. Ідэя творчасці, стваральнага жыцця – цэнтральная ў карціне свету Міхала Клеафаса. Творчая філасофія, якой ён прытрымліваўся, вынікала з ідэі свабоды і веры ў яе, з думкі, што чалавечы дух дыктуе свае законы ўсяму існаму. Зыходзячы з гэтага прынцыпу, М. Агінскі, як, дарэчы, і большасць прадстаўнікоў княскага роду, аддана служыў Радзіме, абараняў яе незалежнасць і суверэнітэт, годна прадстаўляў сваю краіну.

Кніга "Вілія і яе берагі" графа Канстанціна Тышкевіча, на наш погляд, з'яўляецца яшчэ адной старонкай у айчынным агінсказнаўстве, садзейнічае выяўленню духоўнага свету знакамітага суайчынніка, 250-гадовы юбілей якога адзначае сусветная супольнасць. Каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі і лад жыцця князя Міхала Клеафаса Агінскага, яго высакароднасць, арыстакратычны кодэкс гонару, рэлігійнасць, адукаванасць могуць служыць узорам для сучаснай беларускай моладзі, садзейнічаць умацаванню яе маральных асноў.

### Спіс літаратуры


1. **Верамейчык, С. І.** Міхал Клеафас Агінскі, 1765 – 1833 : Продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі (спроба храналогіі) / С. І. Верамейчык. – Мінск : Кавалер, 2008. – 128 с.
2. **Залуский, А.** Время и музыка Михала Клеофаса Огинского / А. Залуский. – Минск : Четыре четверти, 1999. – 189 с.
3. **Капилов, А. Л.** Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX вв. / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск : Институт современных знаний, 2000. – 144 с.
4. **Міхал Клеафас Агінскі** (1865 – 1833) // Літаратура Беларусі XIX стагоддзя : анталогія / укл. : К. А. Цвірка, І. С. Шпакоўскі, К. У. Антановіч; навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 27 – 28.
5. **Немагай, С.** Жыццё і творчасць М. К. Агінскага ў каардынатах яго часу і культурнага асяроддзя / С. Немагай. – Мінск : БДАМ, 2007.
6. **Jankowski, Cz.** Powiat Oszmianski / Cz. Jankowski. – Petersburg, 1897. – T. 2. – S. 196.
7. **Tyszkiewicz, Hr. Konstanty.** Wilija i jej brzegi / Hr. Konstanty Tyszkiewicz. – Vilnius, 2008. – 362 s.



**Аляксандр СМОЛІК,**
доктар культуралогіі, прафесар,
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтваў.


*Аўтар ахвярue ганарар на развіццё часопіса.*